**А.М. Макарэвіч *(Магілёў)***

# “НЯСКОНЧАНАЯ ДРАМА” Ф.АЛЯХНОВІЧА: УЗВЫШЭННЕ ЦІ ЗНІЖЭННЕ САЦЫЯЛЬНАГА ТЫПА І ЛІТАРАТУРНАГА ВОБРАЗА

Некаторыя з твораў Ф.Аляхновіча ацэньваюцца часам літаратуразнаўцамі не з пазіцыі мастацкай напоўненасці і пераканальнасці п’есы, а з пункту погляду нацыянальнай ідэі, якая дамінуе ў яе сэнсавым рэчышчы. Такую выснову можна аднесці і да ацэнак, якія прапаноўваюца ў сувязі з характарыстыкай “Нясконочанай драмы”. Маючы на ўвазе вывады М.Гарэцкага, А.Сабалеўскага, У.Коваля, В.Максімовіча і інш. даследчыкаў, памя-

таючы заўвагу В.Максімовіча аб тым, што “драматычныя творы Ф.Аляхновіча разглядаюцца прыземлена, спрошчана, павярхоўна”, што “ўдумліваму аналізу перашкаджае празмерная ўвага да побытавага матэрыялу”, а таксама ўлічваючы спецыфіку “новай драмы” Ф.Аляхновіча, аб якой пісалі У.Ковель і В.Максімовіч, звернемся да характарыстыкі некаторых асаблівасцей “Нясконччанай драмы” ў кантэксце вылучанай тут праблемы.

Даследчыкаў прываблівае “моцная сфера ідэйнага прыцяжэння” гэтага твора [2, 347], *аб ёй* яны ў большай ступені разважаюць, *яе* каменціруюць.

Аднак жа п’еса ў большай ступені напоўнена апасродкаваным публіцыстычным грамадзянскім заклікам, а не мастацкім пераканаўннем! Псіхалагічны струмень у ім прадстаўлены на ўзроўні супроцьстаяння ў бытавым канфлікце. Гэтае супроцьстаянне толькі-толькі акрэслена ў пачатку твора праз інтрыговую мастацкую інфармацыю, сэнс якой у наступным: Васіль мае дваістыя адносіны да Костуся з-за таго, што не можа зразумець прычыны, якія трымаюць сябра ў Вільні ў час такой грамадскай завірухі. Яшчэ адзін бок бытавога канфлікту: паміж Васілём і Ядзькай, якая не разумее творчых  і грамадзянскіх памкненняў Васіля; яна, натуральна, клапоціцца перш за ўсё пра маленькага сына, пра дабрабыт у хаце. Канфліктная сітуацыя паміж Васілём і Костусем толькі акрэслена, яна не паглыблена і не развіта на псіхалагічна-сэнсавым узроўні. Працяг гэтай канфліктнай сітуацыі развіваецца ў бытавым (зноў жа!) рэчышчы. Найбольш пераканальным пры гэтым з’яўляецца не вобраз галоўнага героя, а вобразы Ядзькі і Костуся; для апошняга вобраза характэрныя элементы мастацкай інтрыгі, нават элементы псіхалагізму: ён “жывы”, рэальны, пераканальны.

М.Гарэцкі характарызаваў “Пана міністра” і “Нясконччаную драму” як творы, якія “вельмі ўдачна малююць беларускі рух, жыццё беларускіх працаўнікоў-адраджэнцаў, з адкрытым выяўленнем і добрых, і благіх старон нацыянальнага руху. Тут мы бачым асоб, якія лёгка нагадваюць нам шырока ведамых у гісторыі нашага руху людзей, часам бачым нават некаторую партрэтнасць”[1, 363]. Такая характарыстыка “Нясконччанай драмы” мае два сутнасныя планы: а) канстатацыю: Аляхновіч адкрыта выяўляе <…>, б) адсутнасць канкрэтных характарыстык, “старон нацыянальнага руху”, адлюстраваных Ф.Аляхновічам. Другі сутнасны план з вывадаў М.Гарэцкага спрыяў таму, што стала ўзвышацца першая выснова з яго вывадаў: ‘Нясконччаная драма” “вельмі ўдачна” малюе беларускі рух”. Гэтае “ўдачна” ў некаторых выпадках успрымалася даследчыкамі літаратуры як сінонім слову “пераканальна”.

Фактычны матэрыял “Нясконччанай драмы” дазваляе сцвярджаць, што п’есе акрэслены прыватны бок жыцця некаторых з удзельнікаў нацыянальнага руху, “добрыя і благія” (М.Гарэцкі) бакі яго ў прыватным асвят-

ленні. Мастацкую пераканальнасць тут замяняюць банальныя каментарыі і канстатацыі дзеючых асоб. Вобраз Васіля – плакатны вобраз; адзін з тых, якія шырока затым распаўсюдзяцца ў беларускай літаратуры другой паловы 20-х – 30-х гадоў, – вобразаў ужо бальшавіцкай арыентацыі. Калі ж адкінуць нацыянальнае і бальшавіцкае ад аднаго ці другіх вобразаў – ідэю – становіцца відавочнай іх плакатнасць. У гэтых адносінах можна параўнаць "Няскончаную драму" Ф.Аляхновіча з апавяданнямі "Больш за ўсіх" (1923) і "Таварышы" (1927) Ц.Гартнага.

Думаецца, што некаторыя ацэнкі мастацкіх вартасцей "Няскончанай драмы" (напрыклад, вывады А. Сабалеўскага [5, 111]) грунтуюцца часам на сутнасці нацыянальнай асветніцкай ідэі, якая ў ёй праводзіцца. Аднак жа мастацкія вартасці твора, тым болей драматургічнага, – гэта не толькі ідэя, а цэлы комплекс асаблівасцей, якія пераканаўча *пацвярджаюць* ідэю. П'еса ж Ф.Аляхновіча напоўнена канстатацыйнымі сцверджаннямі некаторых ідэйных высноў нацыянальна-адраджэнскага характару.

Непераканальнай, на мой погляд, з'яўляецца ідэйная пазіцыя Васіля, калі ўлічыць той факт, што яго душа (душа чалавека, які арыентуецца на нацыянальнае адраджэнне) патрабуе ўласнага духоўнага ўдасканальвання, бо для гэтага чалавека чужымі з'яўляюцца такія паняцці (і адпаведныя ім дзеянні), як любоў да дзіцяці, маральны абавязак перад сям'ёй, шчырасць у адносінах з жонкай, якую ён не кахае і перад якой блюзнерыць, выдаючы жадаемае за сапраўднае[1]. Матывацыя ўчынкаў Васіля пры гэтым грунтуецца на выкананні ім пэўнай ролі грамадскага дзеяча, які поўнасцю выракаецца сям'і, а не на раскрыцці немагчымасці выконваць гэтую – сямейную – ролю. Імкненне Васіля да грамадзянскай і асабістай волі перакрэслівае права блізкіх яму людзей мець уладкаванае сямейнае жыццё ў адпаведнасці з іх правам на жыццё ўвогуле. У гэтых адносінах проста абсурдным выглядае банальны ўчынак Васіля ў той момант, калі ён вымушаны выканаць сваё абяцанне: аддаць Костусю грошы, якія яму вінен.

Даследчыкі звяртаюць увагу на аўтабіяграфічнасць "Няскончанай драмы" Ф.Аляхновіча. Але тут трэба дадаць: аўтабіяграфічнасць у п'есе фактуальнага характару, а не ўвогуле аўтабіяграфічнасць, якая можа мець два аспекты: падзейны і сэнсавы. Падзейны бок тут шмат у якіх фактах супадае. Ці ж супадае сэнсавы? Думаю, што не. Пры гэтым варта зноў прыгадаць двухаспектныя выказванні М.Гарэцкага: Ф.Аляхновіч паказаў і добрыя, і кепскія бакі нацыянальнага руху. Магчыма, у большай ступені драматург акрэсліў негатыўныя яго бакі маральнага кшталту. Маральны разлад у душы адраджэнца выклікае разлад падзейнай плыні ў яго жыцці і

[1] Праўда, гэты вобраз можна характарызаваць у кантэксце асаблівасцей характару героя "новай драмы" Ф.Аляхновіча, звяртаючы ўвагу на іншыя акцэнты ў ім, але такі разгляд наўрад ці зменіць сутнасць характару Васіля.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

лёсе яго блізкіх. Відаць, Ф.Аляхновіч не столькі ўзвышаў Васіля, колькі імкнуўся паказаць прыземленасць сутнасці яго характару ў спалучэнні з "узвышанай" банальнасцю грамадзянскай яго позы. Як бы там ні было, але апошняе ў творы відавочнае, хоць і аточанае высокімі словамі і адраджэнскімі ідэямі. У той жа час працэс гэтага "прызямлення" рэалізаваны ў творы толькі часткова; частковым, у мастацкіх адносінах не надта пераканальным з'яўляецца і працэс ідэйнага ўзвышэння Васіля, калі дапусціць, што гэты вобраз рэальна (а не патэнцыяльна) ідэйна ўзвышаны.

Паколькі паняцце "нацыянальнае адраджэнне" для гісторыкаў літаратуры – паняцце заўсёды высокае, то гэты факт у некаторых выпадках прадвызначаў узвышаную характарыстыку і мастацкіх вартасцей "Няскончанай драмы" Ф.Аляхновіча.

***Літаратура***


1. ***Гарэцкі М.*** Гісторыя беларускае літаратуры. – Мінск, 1992. – С. 358 – 364.
2. ***Ковель У.*** Францішак Аляхновіч 1883 – 1944 // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. Т.1. – Мінск, 1999. – С. 335 – 357.
3. ***Максімовіч В.А.*** Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. – Мінск, 2000. – С. 321 – 341.
4. ***Сабалеўскі А.*** На адраджэнскай хвалі // Полымя. – 1992. – № 5. – С. 109 – 112.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова